Источник: **«Звязда» - 2013-03-19**

## Заўжды жывы

### Беларускія кінематаграфісты вярнулі Лангбарда на радзіму

У мінулым годзе да 130-годдзя вядомага беларускага архітэктара Іосіфа Лангбарда ў Нацыянальным мастацкім музеі адбылася выстава, на якой упершыню былі экспанаваны эскізы і малюнкі Лангбарда, што захоўваюцца ў музеі гісторыі Санкт-Пецярбурга. Пасля смерці Лангбарда ў 1951 годзе яго жонка Вольга пісала кіруючым уладам Беларусі з прапановай аддаць каштоўныя для нашай краіны рабочыя матэрыялы архітэктара. Тады ёй ніхто не адказаў. А сёння найкаштоўнейшыя малюнкі знаходзяцца ў сховішчах іншай краіны. А прывезці іх на выставу — вельмі няпроста. Тыповая для Беларусі сітуацыя...

Дарэчы, такая абыякавасць да творчай спадчыны архітэктара, які нарадзіўся ў гродзенскім Бельску, пасля яго смерці была выклікана якраз тым, што ўсё, што ён мог даць архітэктуры Беларусі, ён ужо даў. А пасля гэтага савецкія ўлады зрабілі звыклы для сябе ход — абвясцілі мастака буржуазным і пачалі ставіць палкі ў колы. Так што Лангбарду немагчыма ўжо было працаваць у Мінску. І ён канчаткова пераехаў у Санкт-Пецярбург.

Пра гэтыя і яшчэ многія цікавыя факты мы можам даведацца з дакументальнага фільма "Архітэктар Лангбард. Незапатрабаваны архіў", які на Беларускім відэацэнтры зрабіў Аляксандр Аляксееў. Стужка гэтая вельмі цікавая тым, што зноў-такі ў ёй выкарыстаны нідзе раней не публікаваныя архівы беларускага архітэктара. Упершыню іх прадэманстравалі ў дакументальным фільме з дазволу Санкт-Пецярбургскага музея. І тое дзякуючы асабістым дамоўленасцям Белвідэацэнтра. Першапачаткова за паказ аднаго малюнка прасілі грошы, якія значна перавышалі бюджэт усяго фільма. Так БВЦ хоць праз кіно, але вярнуў спадчыну архітэктара на радзіму.



**Паводле першапачатковай задумы Лангбарда будынак беларускага опернага тэатра павінен быў мець чырвоны колер.**

І гэта спадчына менавіта беларускага архітэктара. І не толькі таму што яўрэйская сям'я Лангбарда жыла ў Заходняй Беларусі. Але і таму што Лангбарду было ўласціва

паважлівае і беражлівае стаўленне да беларускай культурнай спадчыны. Пасля Вялікай Айчыннай вайны, калі ўсе яго мінскія стварэнні (Оперны тэатр, Дом урада, Дом афіцэраў, галоўны корпус Акадэміі навук Беларусі, кінатэатр "Перамога" — пабудаваны ўжо ў пасляваенны перыяд) былі ў той ці іншай ступні пашкоджаны, ён з імпэтам узяўся іх аднаўляць. І сцвярджаў, што асновай архітэктуры Беларусі з'яўляецца вывучэнне старажытных помнікаў беларускай культуры. У тым ліку і за гэта яго сталі актыўна выціскаць новым пакаленнем маладых архітэктараў. А потым, у дадатак да ўсяго, назвалі яшчэ і "буржуазным"... Тады гэты прыметнік зачыняў усе дзверы...

І пра ўсё гэта мы таксама можам даведацца з фільма Аляксандра Аляксеева. Здымалі фільм у Мінску і Пецярбургу. Туды ездзілі не толькі ў архівы. Але і каб пагутарыць з жывымі сваякамі Лангбарда — унучатым пляменнікам і ўнучкай Святланай Сакаловай, якая, дарэчы, прысутнічала на прэм'еры фільма ў Мінску.

Фільм створаны відавочна для тэлебачання ў фармаце расповеду пра найгалоўнейшыя вехі жыцця і творчасці архітэктара. І суправаджаецца нейкім савецкім пафасам. На такія асацыяцыі натхняе дыктарскі голас і суправаджальная музыка. Быццам аўтары фільма стараліся даць архітэктару тое, чаго ён быў пазбаўлены пасля вайны; кампенсаваць незапатрабаванасць і рэзкую адсутнасць усеагульнага захаплення. Да вайны, з'яўляючыся пераможцам шматлікіх архітэктурных конкурсаў, Лангбард быў абсалютным лідарам у архітэктурнай суполцы Беларусі. Нават вадзіў знаёмства з самім Сталіным. Па волі выпадку. Калі з пецярбургскага дома Бенуа, дзе жыла сям'я Лангбардаў, забралі жонку Вольгу, вярнуць яе дапамагаў сам Панамарэнка. Пасля чаго асабістая сустрэча са Сталіным была непазбежнай.

Пасля ад'езду Лангбарда з Мінска ў пачатку 1948 года чыноўнікі-камуністы зрабілі ўсё, каб пра знакамітага архітэктара забылі. Цяпер адбываецца адваротны працэс. І фільм гэтаму яўна паспрыяе. Асабліва, калі патрапіць на тэлебачанне. Паколькі, нягледзячы ні на што, Іосіф Лангбард быў вельмі адметным творцам. Уявіце хаця б тое, што па яго задуме будынак беларускага опернага тэатра павінен быў мець чырвоны колер.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**